*А. У. Любы*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*A. Liuby*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476+474.5)**

# ЯГЕЛОНЫ І ІХ ЭПОХА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТ.: ЭВАЛЮЦЫЯ ПРАБЛЕМАТЫКІ

# THE JAGIELLONS AND THEIR EPOCH IN THE NATIONAL HISTORIOGRAPHY OF BELARUS AND LITHUANIA (XX – EARLY XXI CENTURY): THE EVOLUTION OF PROBLEMS

*У артыкуле разглядаецца месца і роля эпохі і прадстаўнікоў дынастыі Ягелонаў у нацыянальным гістарычным наратыве Беларусі і Літвы ў ХХ – пачатку ХХІ ст. Аўтар выкарыстоўвае параўнаўчы аналіз для вылучэння асноўных блокаў праблем у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XV – першай паловы XVI ст., характарызуе тры перыяды ў вывучэнні Ягелонаў у гістарыяграфіі. Адзначаны таксама прычыны змен, якія адлюстроўвалі эвалюцыю інтэрпрэтацый перыяду ў нацыянальных гістарыяграфіях.*

*Ключавыя словы: Ягелоны; гістарыяграфія Беларусі і Літвы; Вялікае Княства Літоўскае; нацыянальны гістарычны наратыў.*

*In this article, the author draws attention to the place and role of the Jagiellons epoch and representatives of this dynasty in the Belarussion and Lithuanian national historical narrative in the twentieth and early twenty-first centuries. The author uses a comparative analysis to identify the main problematic blocks in the history of the Grand Duchy of Lithuania of the 15th – first half of the 16th century, characterizes three periods in the study of the Jagiellons in historiography. The reasons for the changes that reflected evolution of interpretation of the period by national historiographies were noted by him.*

*Key words: The Jagellons; Historiography of Belarus and Lithuania; the Grand Duchy of Lithuania; national historical narrative.*

Ягелоніка як кірунак гістарычных даследаванняў не атрымала шырокага распаўсюджання ў нацыянальных гістарыяграфіях ні Беларусі, ні Літвы ў перыяды свайго самастойнага станаўлення і развіцця ў ХХ ст. Эпоха Ягелонаў у Вялікім Княстве Літоўскім, якая доўжылася ад увакняжання ў Вільне Казіміра Ягайлавіча ў 1440 г. да смерці Жыгімонта Аўгуста, інтэрпрэтавалася ў нацыянальных наратывах Беларусі і Літвы першай паловы ХХ ст. аднолькава – гэта шлях да паступовага абмежавання палітычнай самастойнасці Вялікага Княства, а значыць, і перарывання дзяржаватворчай ініцыятывы беларускай і літоўскай нацыі. Што не ў малой ступені можа быць інтэрпрэтавана праз уплыў антыманархічных тэндэнцый і сацыяльна-палітычных ідэй у раскрыцці гісторыі народа, а таксама своеасаблівым ідэалагічным непрыняццем усяго польскага ў мінулым краю (і хаця падставы для падобных сцвярджэнняў у Літоўскай

Рэспубліцы і БССР мелі розныя канатацыі, вынік дасягаўся падобны – варожасць да «польскіх паноў»).

Падобную ацэнку міжваеннага беларускага нацыянальнага наратыву можна параўнаць з высновамі нямецкага гістарыёграфа Райнэр Ліндэра (Rainer Lindner), які адзначыў, што да 1934 г. аўтары (перадусім В. Ластоўскі, а таксама У. Ігнатоўскі, У. Пічэта, часткова В. Дружчыц) ідэалізуюць перыяд кіравання вялікага князя Вітаўта, а яго смерць называюць канцом «самастойнай [палітычнай] гісторыі». Пры гэтым XV – пачатка XVI ст. разглядаюцца як «беларускі залаты век» у культуры. Гісторыкі ўводзяць спецыяльнае вызначэнне перыяду – «змаганне культур», у адносінах паміж польскай і беларускай [6, с. 85–88, 252, etc.]. Да падобных жа высноваў у ацэнцы літоўскай версіі нацыянальнай гісторыі падводзіць нас Ежы Клачаўскі (Jerzy Kłoczowski). У характарыстыцы «Гісторыі Літвы» гістарыёграф Зенон Івінскіс (Zenonas Ivinskis) адзначае, што ў параўнанні з міжваенным польскім наратывам, дзе ўзвышаецца роля ў стварэнні польскай дзяржавы дынастыі Ягелонаў, у літоўскім нацыянальным наратыве адбываецца гераізацыя дынастыі Гедымінавічаў, у прыватнасці вялікага князя Вітаўта і яго перыяд праўлення [11, с. 7].

Такім чынам, эпоха Ягелонаў у Вялікім Княстве патрапляе ў становішча падвойнай інтэрпрэтацыі: палітычнага заняпаду дзяржаўнасці пры відавочным культурным прарыве і заходнееўрапейскай сацыяльна-рэлігійнай арыентацыі. Відавочна, аўтары 1920-х гг. у сацыяльным плане імкнуцца разглядаць усё насельніцтва дзяржавы цалкам, вылучаючы толькі кіруючыя колы як знешні элемент, сфарміраваны палітыкай заключэння дзяржаўных уній з Польшчай і кіраваннем прадстаўнікоў дынастыі Ягелонаў, асноўных праваднікоў польскага ўплыву ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Гісторыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Універсітэта Вітаўта Вялікага зрабілі дастаткова дакладны ўнёсак у фарміраванне нацыянальнага погляду на падзеі вызначанага перыяду (Васіль Шчарбакоў, Ёнас Матусас, Адольф Шапока), і хаця іх навуковая спадчына выкарыстоўвалася ў 1940–1970-я гг. у савецкіх рэспубліках досыць абмежавана, асноўная агульная ідэя «недаверу» да уній Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам праіснавала ў абодвух нацыянальных наратывах да пачатку 1990-х гг.

За савецкі пасляваенны перыяд развіцця нацыянальных гістарыяграфій і беларуская, і літоўская былі пастаўлены ў вельмі вузкія праблемныя рамкі. Гэта практычна выключыла з наратыву такія дыскурсы, як дынастычны, інтэграцыйны (нават еднасць сацыялістычнага блока дзяржаў не дазваляла развівацца праблематыцы Еўропы Ягелонаў), этнарэлігійны, таксама погляд на элітарную культуру і інтэлектуальны асяродак. Пануючы ў гістарычнай навуцы фармацыйны падыход засяроджваў увагу на сацыяльных праблемах і эканамічным становішчы насельнікаў Вялікага Княства Літоўскага, ігнаруючы палітычную складаючую існавання дзяржавы на даўніх тэрыторыях існуючых у той час БССР і Літоўскай ССР (падручнікі, энцыклапедыі).

Цікавым для параўнання выглядае змест абагульняючых прац па гісторыі Беларусі і Літвы, выдадзеных у Польскай Народнай Рэспубліцы ў канцы 1970-х гг.: этапы гісторыі (у тым ліку і Сярэднявечча і ранняга Новага часу) больш прапарцыянальныя, чым падавалася ў айчыных, дзе перыяд пераходу да сацыялізму дамінуе над астатнімі перыядамі [12; 13]. Зрэшты, і перыядызацыя, прапанаваная М. Косманам, ішла ў супраціў агульнапрынятай – пачаткам адліку панавання Ягелонаў над Вялікім Княствам (кардынальных змен у палітыцы) прапаноўвалася лічыць заключэнне Крэўскай уніі і каранацыю Ягайлы, а не смерць Вітаўта ці каранацыю Казіміра Ягелончыка ў Вільне [13, с. 70].

Эмігранцкая літаратура паступова развівалася ў кірунку абсалютызацыі этнасацыяльных асаблівасцяў і нацыятворчых працэсаў у ранні Новы час, але адыходзіла ад палітычных і культурніцкіх праблем. Пастаўленыя эмігранцкай супольнасцю пытанні зацягвалі гісторыкаў у больш раннія часы існавання Вялікага Княства (напрыклад, работы П. Урбана за 1960–1970-я гг., прысвечаныя этнічным працэсам і нацыянальнай прыналежнасці насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага; З. Івінскіса – хрысціянізацыі Літвы). Перыяд XV–XVI стст. патрабаваўся толькі для раскрыцця вынікаў такіх працэсаў.

Істотныя змены назіраюцца ў беларускай і літоўскай гістарыяграфіях у другой палове 1980-х гг., калі ва ўмовах палітычных пераўтварэнняў у СССР адбываецца абуджэнне цікавасці да нацыянальных гісторый. А гэта, у сваю чаргу, пашырае спектр пытанняў і праблем, закранутых даследчыкамі. Эпоха Ягелонаў бачыцца сярод такіх «белых плям», патрабуе пераасэнсавання ў кантэксце беларуска (літоўска)-расійскіх адносін.

Станаўленне нацыянальных канцэпцый гісторыі адбываецца ў першыя гады апошняга дзесяцігоддзя XX ст. (у Беларусі – гэта 1993–1994 гг.) Прапанаваныя канцэпцыі ў першую чаргу ўлічваюць палітычную складаючую развіцця Вялікага Княства, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя працэсы і ацэнку фактараў развіцця дзяржаўнасці на землях. На першы план паступова выходзяць пытанні палітычных эліт і нацыянальнай прыналежнасці герояў эпохі, даюцца ацэнкі маркерам памяці (даты, падзеі, гістарычныя мясціны, асобы). Ствараецца новае (паслясавецкае і максімальна дыстанцыраванае ад эмігранцкага) пакаленне абагульняльных прац па гісторыі сучасных дзяржаў, складаецца сучасны нацыянальны гістарычны наратыў [3; 5; 8; 9; 14].

Ягелоны і іх эпоха пачынаюць па-рознаму інтэрпрэтавацца ў нацыянальных гістарыяграфіях Беларусі і Літвы. Вяртанне ў нацыянальны гістарычны наратыў біяграфій манархаў Вялікага Княства Літоўскага павінна было паказаць іх «нацыянальную» прыналежнасць. Ствараецца магчымасць аналізу дзейнасці такіх прадстаўнікоў дынастыі Ягелонаў, якія зрабілі значны ўклад у гісторыю асобных рэгіёнаў Княства.

Для літоўскай гістарыяграфіі 1990–2000-х гг. усе асобы-Ягелоны па свайму ўкладу ў развіццё Княства прайгравалі палітычнай асобе Вітаўта (агульнанацыянальны культ князя нараджаецца ў літоўскай грамадска-палітычнай думцы яшчэ ў міжваенны перыяд). Аднак відавочна знакавую ролю ў даследаваннях пачынае адыгрываць асоба Казіміра Казіміравіча, стварэнне культу святасці якога доўгі час было запатрабавана палітыкамі XVI ст. [4, с. 53]. Менавіта ён становіцца сімвалам хрысціянізацыі і канчатковага далучэння Літвы (што больш істотна для сучаснікаў) да заходнееўрапейскай культурнай традыцыі.

У беларускай версіі гісторыі Вялікага Княства ўвага звяртаецца на іншага прадстаўніка роду – Казіміра Ягелончыка, бацьку [9, с. 100, etc.]. Яго працяглае кіраванне звяртае на сябе ўвагу стратай ініцыятывы тэрытарыяльнага пашырэння дзяржавы за кошт іншых вялікіх княжэнняў Усходняй Еўропы і, што больш істотна для даследчыкаў-сучаснікаў, расколам палітычнай эліты на рускі і польскі лагеры-партыі. І П. Лойка, і Г. Сагановіч акцэнтуюць увагу на замахах на вялікага князя з боку арыстакратаў у пачатку 1480-х гг. [7, с. 127; 8, с. 106–107]. Цікава, што на замахі як ключавыя моманты ў развіцці ўлады дынастыі Ягелонаў у Вялікім Княстве Літоўскім неаднаразова ўкажа ў сваіх артыкулах і літоўскі даследчык брытанскага паходжання С. К. Роўэл (Stephen C. Rowell).

У нацыянальным гістарычным наратыве ўпершыню асэнсоўваюцца месца і ролі дынастыі ў фарміраванні палітычнай культуры зямель Княства. Асабліва гэта праяўляецца ў беларускім дыскурсе пра памежныя войны з Вялікім Княствам Маскоўскім [3, с. 400, 404 etc.; 8, с. 126, etc.] і «ўзаемадзеяння Літоўскай дзяржавы з дынастыяй Ягелонаў» – у літоўскім [5, с. 440, etc.; 17, с. 255, etc.]. Пераважна адносіны да Ягелонаў у беларускім наратыве нейтральныя (за выключэннем асобных падзей, кшталту шлюбу вялікага князя Аляксандра з княжной Алёнай Іванаўнай; ці шлюбная гісторыя Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл). Літоўскія абагульняючыя працы дыстанцыруюцца ад Ягелонаў як дынастыі польскай і яе прадстаўнікоў як галоўных ініцыятараў дзяржаўных уній [14, с. 207, etc.], што ў некаторай ступені мае пераемнасць з міжваеннага нацыянальнага наратыву.

Статус дзяржавы ў XVI ст. моцна змяняецца на знешнепалітычнай арэне, як і яе ўнутранае ўладкаванне. Беларускія даследчыкі шмат увагі звяртаюць на макрапрацэсы ў знешняй палітыцы ў канцы XV – першай палове XVI ст. Так, пад увагу трапляюць пытанні антыягелонскай кааліцыі ў кантэксце пагроз для Вялікага Княства Літоўскага [3, с. 400, etc.], войны канца XV – першай паловы XVI ст. з Вялікім Княствам Маскоўскім разглядаюцца адзіным суцэльным комплексам прайгранай барацьбы за «збіранне рускіх зямель» [8, с. 126–132; 9, с. 107, etc.]. Літоўскія аўтары імкнуліся да разгляду становішча дзяржавы ў кантэксце «паміж Масквой і Польшчай», дзе выбар быў зроблены ў бок найменшага зла [14, с. 211,

etc.], ці разглядаўся прынцып знешнепалітычнай актыўнасці Княства выключна ў дачыненні да істотных пераўтварэнняў у дзяржавах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – бітва пад Мохачам і паражэнне ў барацьбе Ягелонаў з Габсбургамі [5, с. 441–445].

Наступны падзел «спадчыны» гісторыі Вялікага Княства другой паловы XV–XVI ст. праходзіць праз размежаванне палітычнай эліты: свае магнацкія рады, свой адсотак шляхты і г. д. Спрэчныя моманты абмяркоўваюцца падчас канферэнцый, адлюстроўваюцца ў публікацыях дыскусій [1, с. 219–223, 330–335], але амаль не змяшчаюць прамежкавых высноў у сумесных выдавецкіх праектах (як гэта адбываецца ў літоўскіх гісторыкаў з польскімі калегамі, напрыклад у фармаце «Dwuglos'a» Ж. і Ю. Кяўпаў і А. Рахубы, калі польскія і літоўскія аўтары фактычна засталіся пры сваіх меркаваннях наконт асноўных падзей) [15].

У некаторым сэнсе ў 2000-я гг. пераломным момантам становіцца выданне энцыклапедычных спецыялізаваных выданняў такіх як «Вялікае Княства Літоўскае» ў трох тамах [2] і «Культура Вялікага Княства Літоўскага» [16], дзе можна пабачыць погляд на «суседа па гісторыі». Аднак падобныя працы хутчэй будуць пераведзены на трэцюю мову (польскую ці ангельскую), чым дачакаюцца свайго перакладу на мову гістарычнага суседа і змогуць папулярызаваць сумесную гістарычную спадчыну (у адрозненне ад асобных артыкулаў і навуковых манаграфій, якія з канца 2000-х – у 2010-я гг. актыўна з'яўляюцца на старонках выданняў «Arche»).

Выключэннем з'яўляецца праект, запачаткаваны з ініцыятывы папы рымскага Іана Паўла ІІ, які прадугледжваў напісанне і выданне на мовах-спадчынніцах Рэчы Паспалітай нарысаў нацыянальных гісторый [6, с. 430–431]. Беларуская складаючая была напісана Г. Сагановічам [9], а адпаведным варыянтам ад Літвы можна лічыць працу Ж. і Ю. Кяўпамі і А. Кунцэвічусам [14]. Праект задаваў ракурс, але не дыктаваў умовы выкладання.

У спрэчках 1990-х гг. паміж асобнымі прадстаўнікамі нацыянальных гістарычных школ у некаторым сэнсе ідзе апеляцыя да польскага аўтарытэту ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. І калі беларускія даследчыкі аддаюць перавагу гістарыяграфічнай традыцыі міжваенных даследаванняў і аўтарытэтным меркаванням 1930-х гг. (С. Кучыньскага, Л. Каланкоўскага, О. Халецкага), то літоўская гістарыяграфія пераважна апелюе да паваеннай познаньскай школы, хаця і выбарачна абапіраючыся на яе прадстаўнікоў (напрыклад, станоўча адносіцца да Х. Лаўмяньскага, і стрымана – да Е. Ахманьскага).

У 2000-я гг. падыходы нацыянальных школ да перыяду XV – першай паловы XVI ст. яшчэ больш адрозніваюцца. На змену вяртання ў наратыў манархаў прыходзіць абсалютызацыя незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага. Вывучэнню XVI ст. спрыяе даследаванне і выданне Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, выкарыстанне матэрыялу для развіцця новых

кірункаў гісторый: гендэрнай, культуралагічнай (культура рэзідэнцый, двара, мецэнацтва) і інш.

Эпоха Ягелонаў і яе вывучэнне пакрысе распушчаецца ў даследаваннях інтэграцыйных працэсаў у Еўропе ранняга Новага часу. Немалую ролю ў гэтым адыграла вяртанне папулярнасці ідэі спецыфічнай ягелонскай Еўропы (перапрацаваная тэорыя О. Халецкага) і ўступленне Літвы ў Еўрапейскі саюз (2000 г.). Сумесная з палякамі ідэя прэзентацыі сусветнай грамадскасці першай еўрапейскай уніі не можа не адбіцца на зменах падыходаў да даследавання эпохі.

Айчынная гістарычная супольнасць таксама абазначыла ў 2006 г. цікавасць да дынастыі Ягелонаў, эпохі ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і яе спадчыны на Беларусі пры правядзенні тэматычнай канферэнцыі [10].

Асобныя праблемы з гісторыі эпохі Ягелонаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе канцэнтруюць увагу інтэрнацыянальных каманд даследчыкаў у сумесных міжнародных праектах [7]. Аднак сярод удзельнікаў мала прадстаўнікоў літоўскай і амаль не назіраецца беларускай гістарычнай школы. Відавочна, і вынікі іх мала адбіваюцца на зменах нацыянальных гістарычных наратываў, створаных яшчэ ў пачатку 1990-х гг. і існуючых амаль без змен на працягу двух дзесяцігоддзяў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Вялікае Княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991–2003 гг.: матэрыялы міжнароднага круглага стала (Гродна, 16–18 мая 2003 г.) / рэдкал.: С. Б. Каўн (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Медисонт, 2006. – 544 с.

2. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн., 2005 (2-е – 2007). – Т. 1. – 684 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – 688 с.

4. Гісторыя Літвы / А. Эйдзінтас [і др.]; пер. з літ. В. Вячорка. – Вільня: SANTARA, 2014. (Бібліятэчка часопіса культуры «Santara», кн. 211, гал. рэд. Р. Норкус). – 280 с.

5. *Гудавичус, Э.* История Литвы с древнейших времен до 1569 года. – Москва: Фонд имени И. Д. Сытина – Baltrus, 2005. – 640 с.

6. *Лінднэр, Р.* Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчыя працэсы і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / пер. з ням. Л. Баршчэўскага; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 540 с.

7. *Любы А. Ул.* Ягелоніка XXI стагоддзя: макрапраекты па гісторыі дынастыі і рэгіёна ў еўрапейскай гістарыяграфіі // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические науки: сб. науч. ст.: в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск: РИВШ, 2015. – Ч. 1. Вып. 15. – С. 110–117.

8. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

9. *Сагановіч, Г.* Нарысы гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.

10. Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Гальшаны-Навагрудак, 2010 верасня 2006 г.). – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 402 с.

11. Chrystianizacja Litwy / J. Kłoczowski, Z. Ivinskis, J. Fjałek, Z. Wojtkowiak. – Kraków: Znak, 1987. – 352 s.

12. *Kosman, M.* Historia Białosusi / M. Kosman. – Wrocław: Ossolineum, 1979. – 405 s.
13. Historia Litwy / J. Ochmański; wydanie trzecie poprawione i uzupelnione. – Wrocław: Ossolineum, 1990. – 396 s.
14. Historia Litwy od czasów najdawniejszych do 1795 roku / Z. Kiaupa, J. Kiaupienė, A. Kuncevičius. – Warszawa: PWM, 2008. – 386 s. (арыгінальная назва: Lietuvos istorija iki 1795 metų. Vilnius, 2000).
15. Historia Litwy. Dwugłos polsko-litewski / A. Rachiba, J. Kiaupienė, Z. Kiaupa. – Warszawa: DiG, 2009. – 388 s.
16. Kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego: analiza i obrazy. Kraków: Universitas, 2006. – 934 s. (арыгінальная назва: Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra. Tyrinėjimas ir vaizdai. Vilnius, Aidai, 2001).
17. Lietuvos Istorija. T.IV.: Nauji horizontai: Dinastija. Visuomenė. Valstybė. Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė 1386–1529 m. / J. Kiaupienė, R. Petrauskas. – Vilnius: Baltas lankos, 2009. – 552 p.

**(Дата падачы: 28.02.2018 г.)**

*Я. М. Ляпешкін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*Y. N. Liapeshkin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(46)«18»**

# ЭВАЛЮЦЫЯ СЛУЖБОВЫХ ФУНКЦЫЙ І ПАЎНАМОЦТВАЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНАТАРАЎ У ЧАС РЭФОРМАЎ 1860–1870-Х ГГ.

# EVOLUTION OF JOB FUNCTIONS AND POWERS OF THE BELARUSIAN GOVERNORS DURING THE 1860–1870-IES.

*У артыкуле прааналізаваны асноўныя заканадаўчыя акты, якія вызначалі функцыі і межы ўлады губернатараў. Адзначаюцца асаблівасці зменаў губернатарскіх паўнамоцтваў на тэрыторыі Беларусі ў 60–70-я гг. XIX ст. Зроблена выснова аб тым, што абмежаванасць рэформаў на беларускіх землях захавала больш шырокія функцыі мясцовых губернатараў у адрозненне ад унутраных расійскіх губерняў.*
*Ключавыя словы: губернатары; беларускія губерні; чыноўнікі; генерал-губернатары; рэформы 1860–1870-х гг.*

*The article analyzes the basic legislative acts defining the functions and limits of the power of governors. There have been particularly changes in the governor's office in the territory of Belarus in the 60–70-ies. XIX century. It is concluded that the limited reforms on the Belarusian land has kept the broader functions of local governors, in contrast to the internal Russian provinces.*
*Keywords: governors; Belarusian province; officials; governors-general; the reform of the 1860–1870-ies.*

У сучаснай гістарыяграфіі шмат увагі надаецца дзейнасці губернатараў у Расійскай імперыі [1–3]. Разам з тым асаблівасці паўнамоцтваў начальнікаў беларускіх губерняў закранаюцца не так часта. Тым не менш